Незалежнае выданьне Жодзіна й Смалявіцкага раёну

РЭС Панарама

№4(15) 2007

Інфармацыйны агляд рэгіянальных і агульнанацыянальных падзеяў

Навіны, факты, камэнтары, карысныя парады:
эканоміка, грамадзтва, правы, зьмены заканадаўства,
калектыўная абарона грамадзкіх інтарэсаў, правоў і свабодаў ...





Licviny-INFA ПРОСТА – ЖЫЦЬ У СВАБОДЗЕ ... !!!

Беларусы й Чарнобыль

ЧАРНОБЫЛЬ – НАШ БОЛЬ, НАШ ЛЁС і НАШАЯ СПАДЧЫНА

ТРЭБА ЗАСВАЙВАЦЬ УРОКІ І СТВАРАЦЬ ЛЕПШУЮ ГІСТОРЫЮ, КАБ ЖЫЦЬ У СВАБОДЗЕ, ЛЮБІЦЬ І ЎПЭЎНЕНА ГЛЯДЗЕЦЬ У БУДУЧЫНЮ...

Янка (Жодзіна)

Ïðýñ ÏÀÍÀÐÀÌÀ



Ініцыятыва
“Мы - Ліцьвіны”
& Licviny-INFA

Цэнтар Ліцьвіны
ў Жодзіне

×ÀÐÍÎÁÛËÜÑÊ² ØËßÕ

ÏÀÌßÖÜ ² ¡ÐÎÊ²

Аргкамітэт “Чарнобыльскага шляху” зьвярнуўся да беларускага народу

Аргкамітэт у правядзеньні акцыі “Чарнобыльскі шлях” зьвярнуўся да беларускага народу з нагоды 21-й гадавіны катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

У звароце гаворыцца, што “найбуйнейшая ў гісторыі тэхнагенная катастрофа нанесла непапраўныя страты нашай краіне. Прыкладна 2/3 радыяактыўных выкідаў аселі на нашай зямлі, забрудзіўшы прыкладна пятую частку тэрыторыі з 20% насельніцтва”.

“Праз намаганьні дэмакратычных сілаў з канца 80-х гадоў пачалі рабіцца захады дзеля зьніжэньня рызыкі для людзей і стварэньня сыстэмы рэабілітацыі. Нарэшце, у лютым 1991 г. Вярхоўны Савет прыняў “Аб сацыяльнай абароне грамадзянаў, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС”, гаворыцца ў звароце.

“Аднак па меры зацісканьня дэмакратыі кіраўніцтва краіны памяняла стаўленьне да нацыянальнай бяды. Асноўны развал усіх сыстэмаў абароны і рэабілітацыі людзей адбыўся пры цяперашнім кіраўніцтве дзяржавы, якому чарнобыльская праблема перашкаджае імітаваць працьвітаньне краіны.

Сваімі ўказамі А.Лукашэнка адмяніў вялікую частку артыкулаў закону, пазбавіўшы бязьвінна пацярпелых людзей усякай падтрымкі. Былі зьліквідаваныя спэцыялізаваныя мэдычныя ўстановы, уведзены дзяржаўна-бюракратычны, палітычна матываваны кантроль над гуманітарнай дапамогай, і яна спынілася. Спынілі дзейнасьць фондаў, што ажыцьцяўлялі аздараўленьне дзяцей за мяжой, каб дзеці не змаглі бачыць іншы ўзровень жыцьця і палітычны лад...”

У звароце адзначаецца, што кіраўніцтва Беларусі не прыняла прапанову Эўразьвязу аб комплекснай дапамозе ў вырашэньні эканамічных, энэргетычных, сацыяльных і чарнобыльскіх праблемаў.

Чарнобыльскі шлях 2007: мірнае шэсьце і затрыманьні

У Менску дэмакратычныя сілы правялі традыцыйны “Чарнобыльскі шлях”. Нягледзячы на ачапленьні ў цэнтры гораду, да шэсьця далучыліся тысячы чалавек. Пасьля жалобнага мітынгу некалькі дзясяткаў удзельнікаў былі затрыманыя.

Арганізатары хацелі правесьці шэсьце ад плошчы Якуба Коласа да будынку Нацыянальнай бібліятэкі, аднак гарадзкія ўлады дазволілі збор ля Акадэміі навук і далейшае шэсьце па вуліцы Сурганава да Чарнобыльскай капліцы на вуліцы Карастаянавай – там была ўшанаваная памяць ахвяраў катастрофы.

«Ваяваць» працягваюць з-пад цішка. Аб’ектам абраныя – дзеці.

А пракуратура – быццам не заўважае гвалту ...

І гэта – яркая дэманстрацыя ўласнай пазыцыі ...

Паводле арганізатараў “Чарнобыльскага шляху”, у акцыі ўзялі ўдзел каля 10 тысячаў чалавек. Назіральнікі адзначаюць, што сярод удзельнікаў пераважалі маладыя людзі.

Пасьля мітынгу байцы спэцназу міліцыі ачапілі натоўп людзей ля “Макдональдзу” на вуліцы Багдановіча і пачалі брутальна іх зьбіваць і кідаць у аўтобусы. Некалькі дзясяткаў маладых людзей былі затрыманыя і завезеныя ў Цэнтральны РУУС. Там на іх не складалі пратаколы, а толькі бралі адбіткі пальцаў, фатаграфавалі і перапісвалі прозьвішчы.

Каля рэстарацыі “Макдональдз” спэцназаўцы абкружылі групу (прыкладна сотню чалавек) і пачалі ўсіх зьбіваць.

Галіна Кацуба апынулася побач і таксама пацярпела ад міліцыянтаў: “Адзін зь іх штурхнуў мяне ў грудзі, я ўпала на зямлю, якраз на тое месца, дзе адбывалася дагэтуль бойка, на бітыя яйкі”.

“Некалькі чалавек у цывільным з навушнікамі ў вушах, з гэтымі рацыямі. Яны пачалі адыходзіць, а людзі на іх крычаць: “Правакатары!”. Тут другая хваля. Падбегла другая група амапаўцаў. Атрымалася, што я стаяла ў іх на дарозе й іх ня бачыла.

Добра, што я стаяла да іх бокам. Адзін зь іх штурхнуў мяне ў грудзі, я ўпала на зямлю, якраз на тое месца, дзе адбывалася дагэтуль бойка, на бітыя яйкі. Другі, які прабягаў, закрануў мяне па руцэ, калі я ляжала. Цяпер у мяне рука амаль не працуе, я не магу ёй рухаць”.

Актывістку незарэгістраванай арганізацыі “Малады фронт” Касю Галіцкую зьбілі й затрымалі. Яе ўразіла, як спэцназаўцы абышліся з 10-гадовай дзяўчынкай, якая выйшла з “Макдональдзу” й трапіла пад “зачыстку”:

“Дзяўчынка, відаць, была ў шоку. Яна не магла адказаць, як яе клічуць, дзе яна жыве, хто ейныя бацькі...”

“Шмат у каго засталіся на тварах сьляды, у мяне таксама. Потым нас закінулі ў аўтобус. Пры гэтым яны брудна лаяліся матам. У аўтобусе яны заўважылі, што з намі дзяўчынка дзесяці гадоў. Пачалі запытваць, хто яе бацькі, таксама лаяліся на яе матам. Казалі: мы цябе адвучым хадзіць на такія мерапрыемствы.

Дзяўчынка, відаць, была ў шоку. Яна не магла адказаць, як яе клічуць, дзе яна жыве, хто яе бацькі... Таму яе высадзілі недзе ў раёне вуліцы Арлоўскай. Невядома, як яна зарыентуецца — тым больш у такім псыхалягічным стане”.

Кася Краснова таксама была затрыманая й трапіла ў міліцыю. Яна прыгадала, што спачатку ім казалі, што на ўсіх складуць пратаколы, але потым павялі здымаць адбіткі пальцаў і фатаграфаваць як падазраваных у крымінальным злачынстве.

Любоў Лунёва, Менск

Яны не глядзелі, дзеці гэта былі ці дзяўчаты. Яны білі нагамі...”

Затрыманыя пасьля заканчэньня акцыі ўдзельнікі “Чарнобыльскага шляху” маюць намер падаць скаргу ў пракуратуру на дзеяньні спэцназаўцаў. Большасьць зьбітых падчас затрыманьня — школьніцы, студэнткі, ёсьць нават 10-гадовая дзяўчынка. Зьбітыя лічаць, што іх адпусьцілі без складаньня пратаколаў, каб не паведамляць прозьвішчаў спэцназаўцаў.

Дзяўчаты маюць намер падаць скаргу на імя гарадзкога пракурора на спэцназаўцаў, якія іх зьбілі на вуліцы Максіма Багдановіча, а потым затрымалі й адвезьлі ў міліцыю.

Інцыдэнт адбыўся пасьля заканчэньня “Чарнобыльскага шляху”, калі ўдзельнікі ішлі на прыпынкі грамадзкага транспарту.

ÏÐÀ¡ ÍÛ ÔÀÐÏÎÑÒ

“Яны не глядзелі, дзеці гэта былі ці дзяўчаты. Яны білі нагамі — і як маглі”.

“Яны былі з усіх бакоў. Але калі яны пачалі зьбіваць, то рухаліся неяк сьпераду і збоку, адціскалі ў двары. Дзяўчат зьбівалі вельмі моцна. Адну дзяўчыну зьбілі да крыві. Там у асноўным ішлі дзяўчаты. Ахапілі нас 16 чалавек у кола. Адчуваю пабоі ва ўсім целе.

Яны не глядзелі, дзеці гэта былі ці дзяўчаты. Яны білі нагамі — і як маглі. Было такое месіва, амапаўцаў было так шмат, што нічога нельга было разабраць. Яны ведалі, што, напэўна, ім давядзецца ставіць свае прозьвішчы, таму й не складалі пратаколаў”.

Галіна Кацуба лічыць, што спэцназаўцы адмыслова нападалі на самых маладых, каб прадухіліць іхны далейшы ўдзел у вулічных акцыях.

Адметнай рысай сёлетняга “Чарнобыльскага шляху” стала вялікая колькасьць моладзі з розных незарэгістраваных дэмакратычных арганізацыяў.

“Стаяла група спэцназаўцаў, якія папросту не выпускалі хлопчыка. Адзін мужчына, гадоў трыццаці ці болей, патрабаваў ад хлопца (хлопец гадоў чатырнаццаці-пятнаццаці, абсалютна яшчэ дзіця) патрабаваў, каб хлопец зьняў сьцяг і намагаўся яго зьняць.

Потым стаў пагражаць, што яго закінуць у аўтобус, паголяць і запэцкаюць зялёнкай. Казаў, што ў хлопца тады ня будзе ніякага жаданьня хадзіць на гэтыя акцыі. Магчыма, яны атрымалі нейкае распараджэньне ад кіраўніцтва палохаць людзей”.

Неаднойчы людзі, якія былі жорстка зьбітыя падчас затрыманьня за ўдзел у вулічнай акцыі, зьвярталіся ў пракуратуру на дзеяньні спэцназаўцаў, але дагэтуль да адказнасьці не прыцягнулі ніводнага міліцыянта.

У тых выпадках, калі пракуратура пагаджалася, што было перавышэньне службовых паўнамоцтваў, людзям адмаўлялі, спасылаючыся на тое, што немагчыма высьветліць асобы тых, хто іх зьбіваў.

Радыё Свабода

ПАДАДЗЕНА СКАРГА Ў КПЧ ААН

Жодзінскія праваабаронцы падалі зварот у Прадстаўніцтва ААН у Беларусі. Скарга скіроўваецца ў Камітэт па Правах Чалавека. Яна пададзена па факце неправамернай забароны гарадзкімі ўладамі мірнага мітынгу жыхароў Жодзіна ў падтрымку Незалежнасьці Беларусі. Згодна з Міжнародным Пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах і Факультатыўным пратаколам да яго, кожны грамадзянін пры парушэньні ягоных правоў і свабодаў пры бязьдзеяньні нацыянальнай праваахоўнай сыстэмы як паўнавартасны суб’ект Міжнароднага права можа шукаць абароны праз КПЧ ААН (Жэнэва, Швэйцарыя). Рашэньні КПЧ ААН – абавязковыя для выкананьня ...

ПРАВААБАРОНА

АЛЯКСЕЙ ЛАПІЦКІ

СЬВЯТЛАНА ЛАПІЦКАЯ

Дванаццаць патрабаваньняў Эўропы да ўладаў Беларусі - гэта шлях да законнасьці і дэмакратыі, міру і згоды, магчымасьць атрымаць сапраўдную дапамогу для стабільнага разьвіцьця краіны.

Photo: Licviny-INFA





Як кажуць тут "міліцыянты-афіцэры" – гэта рэжымная ўстанова, таму законы (напрыклад Выбарчы Кодэкс) у ейных межах не дзейнічае. , а любая згадка пра права асобы – выклікае тут прыліў некантралюемае агрэсыі ...!? У якой турме толькі іх гэтаму навучылі!? Па простым загадзе заўтра ўсю краіну ці ўвесь сьвет можна назваць рэжымнымі й адмяніць у іх правы, свабоды альбо законы ...

Што тады будзе!? Пытаньне – для пацаноў з нулёўкі ... Падобная "інтэрпрэтацыя тэрміну рэжымны" вядзе да поўнай анархіі "ўжываньня ўлады"– да злоўжываньняў становішчам, што канчаткова дэстабілізуе грамадзтва.

Над аздараўляльным комплексам "Асілак" у Жодзіне можна ўбачыць і не такія "хмары" ...

Пра рынак "Стадзедаўскі", пабудаваны насуперак патрабаваньням СанПіНу цалкам у прамзоне, і казаць не прыходзіцца. Там "гробіцца" здароўе пакупнікоў і прадпрымальнікаў. Але камусьці гэта прыносіць выгоду!?

ПЭЎНА ЗАПАМЯТАЛІ ПАФАРБАВАЦЬ БАРДЗЮРЫ!?

Альбо не хапіла бялілаў ... Ці можа нехта, урэшце, зразумеў – колькі не зафарбоўвай тое, на што глядзець балюча й сорамна, яно застанецца гэткім жа страшэнным, бязгустоўным і непрывабным як і было. Дзіравы бюджэт і безгаспадарчасьць, адсутнасьць якасных матэрыялаў і тэхналёгіяў, звычкі імкнуцца да прыгожага і жыць у прыгажосьці ... – не кампэнсуецца таннай саўковай "паказухаю".

А імкненьне жыць цікава і з густам, не ў "віртуальным заўтра", але ў "натуральным сёньня" ёсьць вынікам канчатковага асэнсаваньня грамадзтвам неабходнасьці кардынальных пераменаў да лепшага, да новых каштоўнасьцяў і свабоды, права і прыгажосьці – да абсалютна новай якасьці жыцьця ...

Здольнасьці разумець, адчуваць і ствараць сапраўдную прыгажосьць, будаваць сапраўды ўтульны й квітнеючы дом для ўласных дзяцей прыходзяць неадразу. Яны нараджаюцца – у свабодзе творчай і мастацкай, палітычнай і грамадзкай, у свабодзе адчуваньня і выказваньня сябе, сваіх думак і памкненьняў гэтак шчыра і дакладна, як ты іх усьведамляеш ...

А гэта можа стацца магчымым толькі тады, калі няма "наглядальніка" і "калючага дроту", калі зламаныя стэрыятыпы, калі ёсьць свабода жыць, свабода самавыяўляцца – падтрыманая і разьвіваемая дзяржаваю свабода індывіда быць сабою і жыць у свабодзе ...

Без гэтага, як не зафарбоўвай нашу сумную сапраўднасьць, пакуль не станеш свабодным, дагэтуль будзеш маляваць і будаваць казармы – замест цывільнага жылля, у якім хочацца жыць; танкадромы – замест ходнікаў і дарогаў, па якіх прыемна хадзіць і езьдзіць; СПЭЦНАЗАЎЦАЎ і АўтаЗакі – замест счаслівых грамадзянаў і вясельных лімузінаў ...

Таму, арыентацыя не на правільную ідэалёгію, а на чалавека, ягоную годнасьць як найвышэйшую дзяржаўную каштоўнасьць – адзіна правільная і вартая ўвагі арыентацыя, якая вядзе да прагажосьці, дастатку і дабрабыту.

×ÀÐÍÎÁÛËÜ!

ÁÛÒ³ Á Þ ÐÀÊÐÀÒÛß – ÄÀÁ²ÂÀ Þ ÖÜ ...

Жодзінскі аздараўляльны комплекс “АСІЛАК” і трактар “Беларус” ...

“Народны пад’езд” “Чарнобыльскага Дому” ... – экспэрымент працягваецца!?

Ганьба, таварышы начальнікі! Ганьба!

Чарнобыльская праблема ў Жодзіне.

“Чарнобыльскі дом”, на якім намаляваная эмблема, сымбаль “мірнага атаму” – нельга не заўважыць у Жодзіне. Тут, збольшага, пражываюць перасяленцы з зоны адсяленьня, забруджанай пасьля катастрофы на ЧАЭС (г.п. Ветка Гомельскай вобласьці) ці з самаго Гомеля.

Адметным ёсьць тое, што дом намаганьнямі мясцовага “начальства”, фактычна, падзелены на дзьве сацыяльна-няроўныя палавіны. Адна – “намэнклятурна-прывілеяваная” (там, дзе пражывае старшыня Жодзінскага Гарсавету А.С. Пугач, супрацоўнікі выканкаму … Другая – “народна-пралетарская”, дзе “знайшлі прытулак” звычайныя грамадзяне (рабочыя й служачыя, лекары й настаўнікі, прадпрымальнікі, грамадзка-палітычныя актывісты, апанэнты рэжыму на выбарах …). На гэтай палове дома як раз і намаляваная сымбалічная для Жодзіна-Паўднёвага эмблема.

Дык праблема ў тым, што Жодзінскае выканкамаўскае начальства, ня гледзячы на гучныя заявы аб комплексным падыходзе ў вырашэньні камунальных праблемаў (што, безумоўна, правільна), у дадзеным выпадку, чамусьці, дзейнічае проста наадварот. Так, пасьля праведзеных у 2004г. дасьледваньняў БНТУ, “намэнклятурная” тарцавая сьцяна дому адразу ж была ўцеплена, а на сьцяну з чарнобыльскай эмблемаю ў горада альбо не хапіла грошай, альбо ідэалягічнага імпэту, альбо не паступала “загаду”…

Больш за тое, жыхарам прыйшлося распачаць сапраўдную “эпапею” з кіраўніцтвам АЖКГ і выканкаму. Чыноўнікам не дастатковым аказалася таго, што людзі зьмярзаюць у кватэрах, дзе ўначы тэмпература апускалася да +7, а ў дзень трымалася ад +9-10 да +12-13 градусаў. Пры гэтым, заключэньнем БНТУ было дадзенае яснае прадпісаньне камунальным службам апрацаваць швы паміж панэлямі з наступным вонкавым уцяпленьнем сьценаў.

За час калектыўных скаргаў “чарнобыльцаў” у АЖКГ пасьпела зьмяніцца аж тры начальніка (Марко В.І., в.а. дырэктара Крацюк А.К., тав. Гумінскі), але праблема так і не вырашылася. У выканкаме ж В.Кашэўскага зьмяніў Васіль Грышчанка. Апошні на сваёй азнаямляльнай сустрэчы з жыхарамі па камунальных пытаньнях, абяцаў Аляксею Лапіцкаму разабрацца й належным чынам, без валакіты, вырашыць пытаньне па Чарнобыльскім доме.

Замест гэтага, пачалася сапраўдная “вайна” АЖКГ з жыхарамі для таго, каб максымальна зацягнуць момант правядзеньня ўцяпляльных работ, прымусам ізымаючы ў замярзаючых людзей плацяжы за неаказваемыя камунальныя паслугі.

Так, заманалічваньне швоў замест 2004-2005 года было праведзена пад уплывам судовага працэсу напрыканцы 2006 года. Потым, ня гледзячы на відавочную актуальнасьць пытаньня, заключэньні санэпідэмстанцыі, калектыўныя звароты людзей, былі прызначаныя чарговыя, дадатковыя досьледваньні БНТУ(!?)

А ў 2007 годзе відавочна вострае пытаньне – нават не было вынесена на паседжаньне выканкаму для ўнясеньня аб’екту ў тытульныя сьпісы й тэрміновага вырашэньня праблемы.

І гэта ўсё рабілася тады, калі жыхары некаторых кватэраў пад’езду, фактычна, прымусова вымушаныя былі пакінуць жыльлё на ацяпляльны пэрыяд, каб пазьбегнуць абвастрэньня прастудных захворваньняў і ўскладненьня хранічных хваробаў. Любы спэцыяліст мэдык пацьвердзіць, што ўмовы пражываньня людзей, якія пацярпелі ад “Чарнобылю” і маюць аслаблены імунітэт павінны быць на

самым вышэйшым узроўні. У іншым выпадку можна казаць пра працяг экспэрымэнту на выжываемасьць.
“Паддосьледнымі вожыкамі” ніхто з Чарнобыльцаў быць не пагаджаўся! Але бытавыя і жыльлёвыя ўмовы ў дадзеным канкрэтным выпадку нагадваюць франтавыя –сапраўдны “палігон для выпрабаваньняў”! Здароўе Чарнобыльцаў аслаблена й патрабуе адпаведных умоваў для рэабілітацыі і ўмацаваньня, а не “намэнклятурна-камунальнага гвалту”, скасаваньня неабходнай дзяржаўнай падтрымкі, ільготаў!

Выглядае так, што жыхарам пад’езду, дзе пражываюць апанэнты А.С. Пугача і дзейснага рэжыму, як бы нагадваюць пра тое, “хто ў доме гаспадар”. Пасьля актуалізацыі пытаньня ўцяпленьня панэльных дамоў у Жодзіне, якое адбылося не без ініцыятыўнага ўдзелу Аляксея і Сьвятланы Лапіцкіх, жыхароў “народнага пад’езду” “Чарнобыльскага Дому” – “працэс пайшоў” яшчэ больш шпаркімі тэмпамі.
Аднак, гэта не закранула “Чарнобыльскага Дому”(!?).
Бо паказальна, паскоранымі тэмпамі пачалі ўцяпляць панэльныя дамы бліжэйшыя да Чарнобыльскага. А на запыты перасяленцаў “народнага пад’езду” з выканкаму адказвалі цьмяна й невызначана.

Спачатку Кашэўскі спыніў апрацоўку сьценавых стыкоў і тлумачыў гэта тым, што дом – першы ў чарзе на ўцяпленьне, таму адразу будзе ўсё зроблена комплексна (!?).
Потым, тав. Грышчанка, спасылаючыся на “чаргу” (якая, відавочна, з 2004 году – толькі павялічвалася) прапанаваў чакаць унясеньня дома ў тытульныя сьпісы (!?) для наступнага вырашэньня пытаньня ледзь не да 2009 года (!?)

Падвядзем вынікі, таварышы-панове. Чарнобыльцы і іхныя хворыя дзеці маючы заключэньне БНТУ з 2004 года можа быць дачакаюцца нармальных умоваў жыцьця у 2009-ым!? І тут цяпер абсалютна відавочна, што дзеці перасяленцаў, дарэчы, зарабляюць хранічныя хваробы выключна з-за цьвердалобасьці ідэалягічных супрацоўнікаў Жодзінскага выканкаму. На народных ці апазыцыйных дзяцей у “ідэолягаў намэнклятуры” не хапае грошай!?
І пасьля гэтага, улада кажа пра “моцную і квітнеючую” краіну, сацыяльную скіраванасьць і народныя прыярытэты (!?) І пры гэтым – рассыпае насеньне для кветак у “пусты прыдарожны пыл” …

Нашыя кветкі – дзеці, іхнае здароўе і счаслівыя ўсьмешкі! Пакіньце сабе ўсе “анютины глазки” з прывыканкамаўска-міліцэйскіх клюмбаў дый упрыгожаныя мелам бардзюры, таварышы-панове! А экзальтаваны вайсковы густ і эстэтыку казармаў – выкарыстоўвайце для ўласных прыватных падворкаў!


Мэр горада, Васіль Грышчанка.

Дабрабыт мусіць быць для кожнага чалавека, а не для “ідэалягічна выпраўленнага” ці “заўсёды правільнага” начальніка.
А адносіны да перасяленцаў, людзей, што бязьвінна панесьлі страты й пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС больш за іншых … – мусяць быць паважлівымі, негаласлоўнымі, а дзейснымі.

Дай Бог, начальнікі з Жодзінскага Гарсавету і выканкаму калісьці зразумеюць свае памылкі. І можа, нават, пакаюцца.

Думаецца, калі б выбары праводзіліся дэмакратычна, празрыста й транспарэнтна, мы больш ня ўбачылі б ва ўладзе тых, каму “пляваць” на суграмадзянаў, выбарнікаў, землякоў.
Ва ўладу ніколі не прайшлі б тыя, што жывуць толькі для захаваньня ўласнага вышэйшага статусу і дабрабыту.

Асобныя зь іх, чырванеючы (не вядома ад злосьці ці ад сораму) у адказ на вострую крытыку апанэнтаў, потым пачынаюць толькі прымітыўна шкодзіць.
Падобныя невыхаваныя, эгацэнтрычныя паводзіны “начальства” нагадваюць “разборкі ў пясочніцы”. Свавольныя, саплівыя хлапчукі ў брудных панамках – дзіцячы сад, дый толькі! Калі ўжо яны пасталеюць!? Калі адчуюць сябе ў бясьпецы й дастатку!? Калі ім прыйдзе на розум, што ўлада не належыць самаму правільнаму прэзыдэнту. Яна належыць усім. Яна – народная і толькі дэлегуецца ў выглядзе абавязкаў і паўнамоцтваў для выкананьня канкрэтных дзяржаўных функцыяў.
Таму чыноўнікі як звычайныя функцыянэры мусяць дакладна выконваць уласныя абавязкі. Усё астатняе – свавольства і злоўжываньне, за якія ёсьць адпаведная адказнасьць па закону.

Але лепшы закон – закон сумленьня. І ганьба таму “начальніку”, які карыстаецца даверам ці цярплівасьцю грамадзянаў, суайчыньнікаў альбо аднолькава пацярпелых ад Чарнобылю сваіх землякоў і замест таго, каб дапамагчы ў вырашэньні праблемаў – стварае ім дадатковыя перашкоды. Ганьба таварышы-начальнікі! Ганьба!

Алесь Вольны, Licviny-INFA

З радыяцыйнага зерня будуць гнаць сьпірт

У Хойніцкім раёне Гомельскай вобласьці завяршаецца рэканструкцыя сьпіртзаводу, на якім будуць выробляць сьпірт зь зерня, забруджанага радыяцыяй.

На сьпіртзаводзе ў аграрнай гаспадарцы "Стралічава", якая знаходзіцца ў Хойніцкім раёне, вырашылі гнаць сьпірт зь зерня, якое забруджанае стронцыем.

Намесьнік начальніка дэпартамэнту ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Мікалай Цыбулька сказаў, што на перапрацоўку будзе паступаць каля 8 тысяч тон зерня з шэрагу забруджаных радыяцыяй раёнаў:

"Зерне ўраджаю 2007 году пойдзе туды. Радыяцыі там ня будзе ў сьпірце. Можна абсталёўваць і рабіць звычайны сьпірт. Рэктыфікаваны. Для харчовых мэтаў можна рабіць".

"А зерне, якое раней выраблялася, куды выкарыстоўвалася?"

"Ішло на фураж. Ну, фураж — гэта фураж. Гэта, як гаворыцца, для сваіх мэтаў, для кармленьня жывёлы. А для эканамічнага падтрыманьня гаспадарак трэба, каб была нейкая рэалізацыя зерня", — кажа Мікалай Цыбулька.

Паводле старшыні Хойніцкага райвыканкаму Мікалая Садчанкі, раней не хапала грошай на будаўніцтва такога заводу.

Цяпер жа ў гэтую справу каля 50 тысяч эўра ўклала МАГАТЭ.

А БЕЛАРУСЬ – ЖЫВЕ!

Родная мова зьберагла ад прысуду

Крымінальная справа супраць грамадзяніна Беларусі Юрася Іванюковіча ў Басманным судзе Масквы можа быць спынена з-за таго, што Юрась дрэнна разумее па-расейску.

23-гадовы Іванюковіч быў абвінавачаны судом за тое, што напісаў маркерам на шыльдзе пасольства РБ у Маскве "Жыве Беларусь!!!" і "БТ хлусіць!!!" Яго зараз жа прымусілі сьцерці надпісы, а потым затрымалі. Крымінальная справа была ўзбуджана паводле артыкула 214 Крымінальнага кодэксу РФ (вандалізм), хоць прадстаўнікі пасольства з нагоды папсаванай маёмасьці ніякіх прэтэнзіяў не выказвалі. Тым ня менш, суд Басманнага раёну Масквы аштрафаваў Іванюковіча на тры тысячы расейскіх рублёў.

Як паведаміў адвакат Іванюковіча Станіслаў Маркелаў, ягоны падабаронны, які стала жыве ў Беларусі, сумленна пералічыў грошы ў бюджэт суседняй краіны, аднак не жадаў здавацца і падаў апэляцыю. У часе новага разгляду сам прадстаўнік пракуратуры прызнаў, што справа не зьяўляецца крымінальнай, а таксама, памылкі дапушчаныя ў абвінаваўчым заключэньні.

Як падкрэсліў С.Маркелаў, новае рашэньне Басманнага суда пазбаўляе Юрася Іванюковіча ад судзімасьці. "Упершыню ў расейскай і нават у савецкай практыцы быў пацьверджаны статус беларускай мовы, - заявіў С.Маркелаў.

- Склаўся прэцыдэнт, калі адсутнасьць перакладчыка зь беларускай мовы спрыяе ў вызваленьні абвінавачанага ад судовага перасьледу.

Паводле СМІ

Мусіць быць дзяржаўная праграма

Іван Нікітчанка: "Мусіць быць дзяржаўная праграма выратаваньня свайго народу".

Паводле акадэміка Івана Нікітчанкі, у Беларусі ў апошнія гады насельніцтва скарацілася на паўмільёна. Паводле экспэртаў ААН, да 2020 году ўжо мільёна ня стане. А ў 2050 годзе краіна страціць трацінну свайго насельніцтва ...

Паводле Радыё Свабода

Licviny-INFA

У выданьні выкарыстоўваецца правапіс першакрыніцаў (калі ён блізкі да сучаснага клясычнага варыянту). Пераклады робяцца з улікам сучаснай канцэпцыі натуральнага ўнармаваньня абодвух правапісаў (да- і пасьлярэфармаванага). Рэдакцыя працуе без карэктара, таму прыносіць свае прабачэньні за магчымыя адрукоўкі ў тэкстах ...



Незалежнае выданьне грамадзкай супольнасьці Жодзіна
(Выдавецкая ініцыятыва "Мы - Ліцьвіны" і агенцыя Licviny-INFA)

Адрас рэдакцыі:
222160 Жодзіна, а/с 201
E-mail: c_licviny@tut.by

Наклад 299 асобнікаў.
Рэдактар АЛЕСЬ ВОЛЬНЫ
Пры передруку спасылка на выданьне і першакрыніцу абавязковая.